

Рака Ула ля Чашнікаў

роў з Балтыйскім морам. Асабліва ж узрасла роля ракі пасля будаўніцтва (1797 – 1805 гг.) Бярэзінскай воднай сістэмы.

З воз. Лепельскае Ула цячэ на У, потым за Чашнікамі крута паварочвае ў Пн – ПнЗ напрамку і каля Чашнікаў адлегласць паміж рэчышчам Улы ў верхнім і ніжнім цячэнні складае 1214 м. Тут у свой час і быў пракапаны Чашніцкі канал, які цяпер страціў сваё значэнне. Ула была не толькі шляхам зносін са знешнім светам. У ёй яшчэ і лавілі рыбу.

Да р. Улы ля в. Зарэчная Слабада прымыкаюць заліўныя лугі, дзе з даўніх часоў чашнічане нарыхтоўвалі сена для жывёлы. 20 – 30 гадоў таму тут буяла такое разнатраўе і разнаквецце, што кветку цяжка было перад сенакосам прайсці праз яго. Цяпер травы сталі больш рэдкімі, як і кветкі – лугавая герань, васілёк лугавы, акопнік, званочкі, крываўнік.

Ёсць прыгожая мясціна на р. Ула ў Чашніках – сядзіба беларускага пісьменніка Янкі Журбы. Яна знаходзіцца па дарозе да льнозавода, адразу за мастом. Ула і яе невялікі прыток Акоп, што цячэ каля сядзібы Я. Журбы (а вышэй па цячэнню каля сядзібы В. Цяпінскага), ствараюць прыгожы прыродны куток. Раней тут была маленькая вёска Купніна. Цяпер жыхары называюць гэта месца «льнозавод». Ула з'яўляецца цудоўным месцам адпачынку жыхароў Чашніччыны.

Усвейка, Усвіж-Бук – правы прыток Улы. Назва ракі гаворыць пра тое, што гэта месца, дзе «звеяны» пясок. Даўжыня 116 км. У вярхоўі каналізаваная. Цячэ ў Талачынскім і Чашніцкім раёнах. Водазабор (708 км$^2$) – дробнаўзгорыстая, перасечаная асушальнымі